ВОЛЬНЫЙ ТРУД
БЕЛОСТОК
24 СЕН 40 г.

# МІНСКІ ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА

Радасна сустрэлі беластоцкія вучні прыбыццё ў наш горад Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача імені Н. К. Крупскай.

Гэта адзін з лепшых дзіцячых тэатраў Совецкага Саюза. Дастаткова сказаць, што больш, чым з 150 дзіцячых тэатраў нашай краіны толькі 16 (у тым ліку і Мінскі тэатр імені Крупскай) адабраны для ўдзелу ва Усесаюзным праглядзе.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам мастацкі кіраўнік тэатра тав. М. Сухарэў заявіў:

— Асноўная задача нашага тэатра — гэта абслугоўваць дзяцей і моладзь высокамастацкімі спектаклямі, пабудаванымі на класічных і совецкіх п'есах. Хаця тэатр дзіцячы, аднак спектаклі, якія ставіць тэатр, павінны таксама зацікавіць і дарослага гледача.

Характар нашага тэатра па сутнасці сінтэтычны. Для выражэння ідэі твора аўтара мы карыстаемся ўсімі сродкамі сцэнічнай выразнасці — акторскім майстэрствам, харэаграфіяй, музыкай і песняй.

У Беластоку тэатр пакажа пастаноўкі «Як гартавалася сталь» па раману Нікалая Астроўскага ў інсцэніроўцы М. Юдзелевіча і Е. Раймонд (пастаноўка народнага артыста БССР, ордэнаносца Е. А. Міровіча; п'есу В. Вольскага «Цудоўная дудка» ў пастаноўцы Міровіча; «Снежную каралеву» — п'есу Е. Шварца па літаратурных матывах Андэрсена ў пастаноўцы рэжысера Р. Сусловіча; «Ноч у верасні» Е. Чэкіна (пастаноўка Міровіча). Тут, у Беластоку, адбудзецца прэм'ера «Казкі» М. Светлова ў маёй пастаноўцы.

У Беластоку мы прабудзем да 15 кастрычніка. Адсюль паедзем у Маскву на Усесаюзны прагляд дзіцячых тэатраў.